**ГУТАРКА** – славесны метад навучання ў форме дыялога, у якім настаўнік з дапамогаю дакладнай сістэмы пытанняў правярае засваенне вучнямі раней вывучанага матэрыялу, аналізуе тэкст мастацкага твора, замацоўвае і абагульняе толькі што вывучанае. Гутарка – найбольш распаўсюджаны метад выкладання літаратуры ў школе.

Поспех гутаркі шмат у чым залежыць ад таго, наколькі ўзаемазвязаны паміж сабою пытанні, кожнае з іх – гэта разумовая задача, вырашэнне якой дае настаўніку і вучням магчымасць рухацца далей па шляху да пазнання ісціны.

Як правіла, для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці школьнікаў пытанні ставяцца перад класам і толькі пасля гэтага выклікаецца вучань для адказу. Настаўнік можа пры неабходнасці задаваць дадатковыя, удакладняльныя пытанні, якія скіроўваюць думку дзяцей у правільным накірунку. Недапушчальныя двухсэнсоўныя пытанні, яны не павінны таксама быць лёгкімі, прымітыўнымі ці празмерна складанымі, невырашальнымі.

Запрашаючы да актыўнага ўдзелу вучняў ў гутарцы, настаўнік звяртаецца да іх са словамі: “растлумачце”, “раскажыце”, “дапамажыце”, “дакажыце” і інш.

Гутарка бывае *рэпрадуктыўная* і *эўрыстычная*.

Рэпрадукцыя (ад *рэ* і лац. producere – рабіць, ствараць) – узнаўленне чаго-небудзь, што захавалася ў памяці.

Эўрыстыка (ад гр. heurisko – знаходжу) – спосаб навучання пры дапамозе навадных пытанняў.

Рэпрадуктыўная гутарка разлічана на аднаўленне ведаў, набытых вучнямі са слоў настаўніка, з мастацкага твора, з падручніка, з даведачнай літаратуры і г.д. Рэпрадуктыўная гутарка выкарыстоўваецца пры паўтарэнні і замацаванні, на ўступных, арыенціровачных і заключных занятках.

Да эўрыстычнай гутаркі настаўнік звяртаецца пераважна пры аналізе мастацкага твора: сістэма ўзаемазвязаных пытанняў дапамагае вучням весці назіранні над тэкстам і рабіць пэўныя вывады.

У час гутаркі могуць узнікаць нечаканыя і не запланаваныя раней пытанні, што звязаны з суб’ектыўным успрыманнем літаратурнага твора. Таму настаўніку неабходна дасканала ведаць матэрыял, мець добрую метадычную падрыхтоўку і ўмець праявіць творчасць.

Гутарка з’яўляецца дзейсным сродкам развіцця інтэлектуальных здольнасцей вучняў, мае вялікія выхаваўчыя магчымасці.